Установа адукацыі
"Беларускі дзяржаўны ўніверсітт культуры і мастацтваў"

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Першы прарэктар
УА "Беларускі дзяржаўны
ўніверсітэт культуры і мастацтваў"
____________________ Ю.П.Бондар
«_____»______________ 2012 г.
Рэгістрацыйны №-УД____/вуч.

**МЕТОДЫКА РАБОТЫ З АМАТАРСКІМ ТЭАТРАМ**

*Вучэбная праграма*

па спецыяльнасці 1-18 01 01 Народная творчасць (па напрамках)
напрамку спецыяльнасці 1-18 01 01-03 Народная творчасць (тэатральная)

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Мінск 2012

***Складальнік***

Р.Л.Бузук, загадчык кафедры тэатральнай творчасці ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў", кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт

***Рцэнзенты***

Г.І.Баравік, прафесар кафедры рэжысуры ўстановы адукацыі "Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў", кандыдат мастацтвазнаўства;

З.М.Пасюціна, дацэнт кафедры тэатральнай творчасці ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў"

***Рэкамендавана да зацвярджэння:***

*кафедрай* тэатральнай творчасці ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў" (пратакол № 12 ад "29" чэрвеня 2012 г. )

*прэзідыўмам* навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў" (пратакол № "___" ________ 2012 г.)

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Адказны за рэдакцыю:

Адказны за выпуск: Р.Л.Бузук

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Дысцыпліна “Методыка работы з аматарскім тэатральным калектывам” займае важнае месца ў тэарэтычнай і практычнай падрыхтоўке будучага спецыяліста, у працэсе выхавання рэжысёраў, арганізатараў тэатральнай творчасці, выкладчыкаў спецыяльных тэатральных дысцыплін спецыяльнасці 1-18 01 01 “Народная творчасць (па напрамках), напрамку спецыяльнасці 1-18 01 01-03 “Народная творчасць (тэатральная)”. Яе выкладанне неразрыўна звязана з засваеннем студэнтамі іншых спецдысцыплін, такіх як “Рэжысура”, “Акцёрскае майстэрства”, “Сцэнічная мова”, “Сцэнічны рух”, “Мастацкае афармленне спектакля” і г.д.

Аснову для выкладання дадзенай дысцыпліны складаюць лепшыя здабыткі нацыянальнай (Е.А.Міровіч, К.М.Саннікаў, В.П.Рэдліх, В.М.Раеўскі, Б.У.Луцэнка і інш.) і замежнай рэжысёрскіх школ, асабліва спадчына К.С.Станіслаўскага, У.І.Неміровіча-Данчанкі, Я.Б.Вахтангава, М.А.Чэхава, У.Э.Меерхольда і інш.

Галоўнай **мэтай** навучання з’яўляецца падрыхтоўка кваліфікаваных рэжысёраў-выхавацелей, якія добра ведаюць спецыфіку працы аматарскага тэатра, здольны кіраваць ім на ўсіх стадыях яго развіцця – ад невялікага тэатральнага калектыву да высокага ў творчых і арганізацыйных адносінах народнага тэатра. Менавіта такі рэжысёр-выхавацель аказвае дзейсны ўплыў на фарміраванне духоўнага вобліку кожнага ўдзельніка калектыву, у стане кіраваць вучэбнай работай студыі, тэхнічных цэхаў і інш.

Выпускнік універсітэта культуры павінен валодаць не толькі прафесійнымі навыкамі рэжысёрскай працы, але і методыкай работы з акцёрам-аматарам, методыкай выхаваўчага працэсу ў калектыве, умець весці вучэбна-выхаваўчую работу, арганізаваць паўсядзённае жыццё калектыву.

У рамках праграмы курса прадугледжана вырашэнне пэўных **задач:**

- тэарэтычнае і практычнае засваенне законаў арганізацыі дзейнасці тэатральнага калектыва, авалоданне методыкай прымянення гэтых законаў у пастановачнай рэжысёрскай рабоце;
- знаёмства з прафесійнай акцёрскай этыкай і дысцыплінай (паводле К.С.Станіслаўскага) і выкарыстанне на практыцы;
- авалоданне асновамі стварэння сцэнічнага вобраза ў розных па жанры і стылі работах;
- выхаванне пачуцця ансамблевасці, калектыўнай творчасці ў тэатральным мастацтве;
- набыццё вопыту сумеснай працы з мастаком, кампазітарам, харэографам і іншымі ўдзельнікамі творча-вытворчага працэса пры стварэнні спектакля.

У выніку вывучэння дадзенага курса студэнт павінен **ведаць:**

- практыку сучаснай сцэнічнай дзейнасці;
- прынцыпы паэтапнасці і паслядоўнасці стварэння спектакля;
- спецыфіку выхаваўчага працэсу ў тэатральным калектыве.

Студэнт павінен **умець:**

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

- выкарыстовываць тэарэтычныя веды і практычныя навыкі ў галіне тэатральнага мастацтва дзеля выкладчыцкай дзейнасці;

- арганізоўваць работу з мастаком-сцэнографам, кампазітарам, дырыжорам, мастаком-харэографам у працэсе стварэння спектакля;

- максімальна раскрыць творчыя магчымасці сцэнографа, кампазітара, балетмайстара ў працэсе работы над спектаклем;

- выкарыстоўваць прафесійныя рэжысёрскія навыкі дзеля стварэння высокамастацкага сцэнічнага твора.

Дадзены курс вывучаецца на працягу чацвёртага года навучання на лекцыйных і практычных занятках. І таму важна, каб яго вывучэнне супадала з вытворчай практыкай студэнтаў у аматарскіх тэатральных калектывах, дзе атрыманыя на вучэбных занятках веды маглі б быць апрабаваны.

Матэрыял курса групуецца па трох раздзелах. У першым раздзеле “Станаўленне і развіццё аматарскага тэатра, яго спецыфіка” асвячаюцца асноўныя гістарычныя этапы і раскрываюцца тэарэтычныя асновы ўзнікнення і існавання самадзейнай тэатральнай творчасці; выяўляюцца патрабаванні, што прад’яўляюцца да аматарскага тэатра і забяспечваюць яго жыццядзейнасць як сферы фарміравання творчай асобы; вызначаюцца мэты і задачы, што стаяць перад рэжысёрам аматарскага тэатра. У гэтым жа раздзеле выяўляюцца спецыфіка аматарскага тэатра і звязаныя з ёю метадычныя асаблівасці работы рэжысёра.

Другі раздзел “Вучэбна-выхаваўчая работа ў аматарскім тэатры” прысвечаны аналізу практычнай дзейнасці рэжысёра ў тэатральным калектыве, аналізу працы па фарміраванні асобы ўдзельнікаў на аснове іх вучэбнай і сцэнічнай дзейнасці, што разглядаецца як сродак выхавання чалавека.

Трэці раздзел “Аматарскі тэатр і яго роля ў сацыяльна-культурным жыцці грамадства” ахоплівае пытанні ўзаемасувязі тэатральнага калектыву з мастацка-пазнавальнымі формамі работы клубаў, Дамоў, Палацаў культуры і інш. У ім разглядаюцца і праблемы прапаганды тэатральнага мастацтва як сродку актыўнага выхаваўчага ўздзеяння аматарскага тэатра на глядацкую аўдыторыю.

Вывучэнне дысцыпліны “Методыка работы з аматарскім тэатрам” разлічана на 44 аўдыторныя гадзіны, у тым ліку 16 лекцыйных і 28 практычных гадзін. Форма кантроля – экзамен.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ПРЫКЛАДНЫ ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН

| Назвы раздзелаў і тэм | Колькасць аўдыторных гадзін | У тым ліку | |
|---|---|---|---|
| | | лекцыі | практычныя заняткі |
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **Раздзел I. Станаўленне і развіццё аматарскага тэатра, яго спецыфіка** | | | |
| Тэма 1. Уступ. Прадмет і задачы курса “Методыка работы з аматарскім тэатральным калектывам” | 2 | 2 | - |
| Тэма 2. Спецыфіка аматарскага тэатра. Пазнавальная, светапоглядная, маральна-эстэтычная, мастацка-творчая функцыі сцэнічнага мастацтва. Мэты і задачы тэатральнага руху на сучасным этапе развіцця грамадства | 4 | 2 | 2 |
| Тэма 3. Гістарычныя аспекты развіцця аматарскага тэатра | 10 | 4 | 6 |
| Тэма 4. Рэжысёр аматарскага тэатра | 4 | 2 | 2 |
| Тэма 5. Стварэнне аматарскага тэатральнага калектыву як працэс. Прынцыпы этыкі К.С.Станіслаўскага – падмурак для фарміравання калектыву | 4 | 2 | 2 |
| Тэма 6. Рэпертуар – люстэрка творчага калектыву. Мастацкія і метадычныя прынцыпы фарміравання рэпертуару. Рэпертуарная палітыка аматарскага тэатра як сродак выхавання асобных якасцей удзельнікаў | 2 | - | 2 |
| **Раздзел II. Вучэбна-выхаваўчая работа ў аматарскім тэатры** | | | |
| Тэма 7. Комплекснасць выхавання ў аматарскім тэатры | 2 | - | 2 |
| Тэма 8. Выхаваўчыя сродкі тэатральнага калектыву | 2 | - | 2 |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | | | |
|---|---|---|---|
| Тэма 9. Планаванне работы тэатральнага калектыву | 2 | 2 | - |
| Тэма 10. Формы павышэння кваліфікацыі рэжысёраў аматарскіх тэатраў | 2 | - | 2 |
| **Раздзел III. Аматарскі тэатр і яго роля ў сацыяльна-культурным жыцці грамадства** | | | |
| Тэма 11. Удзел аматарскага тэатра ў мастацка-пазнавальнай рабоце розных устаноў (навучальных, культуры і інш.) | 2 | - | 2 |
| Тэма 12. Аматарскі тэатр як метадычны цэнтр культуры горада, раёна | 2 | - | 2 |
| Тэма 13. Тэатр і глядач: праблемы ўзаемасувязі | 6 | 2 | 4 |
| **Усяго** | **44** | **16** | **28** |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЗМЕСТ КУРСА

## Раздзел I
## Станаўленне і развіццё аматарскага тэатра, яго спецыфіка

### *Тэма 1. Уступ. Прадмет і задачы курса "Методыка работы з аматарскім тэатральным калектывам"*

Значэнне методыкі работы з аматарскім тэатральным калектывам для будучых рэжысёраў-выкладчыкаў спецыяльных тэатральных дысцыплін.

Навуковы аналіз традыцый і вопыту лепшых аматарскіх тэатральных калектываў — тэарэтычная аснова курса. Роля драматычных гурткоў і аматарскіх тэатраў у эстэтычным выхаванні людзей. Спецыфіка развіцця тэатра на розных гістарычных этапах, формы і метады работы, рэпертуар і склад удзельнікаў — прадмет курса.

Узбагачэнне студэнтаў ведамі методыкі работы з аматарскім тэатральным калектывам, удасканаленне структуры, арганізацыйных формаў і перспектыў развіцця аматарскага тэатральнага руху ў Рэспубліцы Беларусь — асноўныя задачы курса.

Узаемасувязь курса з іншымі спецыяльнымі дысцыплінамі. Агляд і характарыстыка асноўных крыніц ведаў і літаратуры па курсу.

### *Тэма 2. Спецыфіка аматарскага тэатра. Пазнавальная, светапоглядная, маральна-эстэтычная, мастацка-творчая функцыі сцэнічнага мастацтва. Мэты і задачы тэатральнага руху на сучасным этапе развіцця грамадства*

Аматарскі тэатр як састаўная частка сацыяльна-культурнага жыцця краіны. Месца сцэнічнага мастацтва ў сістэме культуры. Тэатральная культура грамадства. Мас-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

так, спектакль, глядач у сістэме асэнсавання мастацкай культуры.

Тэатральнае мастацтва як спецыфічная форма адлюстравання, ацэнкі і пераўтварэння рэчаіснасці, а таксама як від эстэтычнай творчай дзейнасці, формы зносін, сродак выхавання асобы чалавека.

Узаемаадносіны тэатра з кіно, музыкай, харэаграфіяй, выяўленчым мастацтвам, тэлебачаннем, літаратурай і іх узаемаўплыў.

Аматарства як форма творчай працы (рэалізацыя творчых здольнасцей чалавека).

Неправамернасць разумення аматарства як дзейнасці, супрацьлеглай прафесійнай. Склад аматарскага тэатральнага калектыву, раздзяленне функцый паміж членамі калектыву па іх здольнасцях і схільнасцях.

Усеагульнасць законаў тэатральна-мастацкай творчасці. Уменне рэжысёра аматарскага тэатра карыстацца гэтымі законамі ў залежнасці ад узроўню падрыхтоўкі ўдзельнікаў калектыву. Залежнасць методыкі работы рэжысёра ад стадыі развіцця канкрэтнага тэатра.

### *Тэма 3. Гістарычныя аспекты развіцця аматарскага тэатра*

Вытокі развіцця аматарскага руху. Зараджэнне беларускага аматарскага тэатра.

Народныя мастацкія традыцыі. З'яўленне скамарохаў. Лялечны тэатр "батлейка" ў Беларусі ў канцы XVI ст. Стварэнне школьных тэатраў (XVI—XVIII стст.) у многіх гарадах Беларусі.

Прыгонны тэатр сярэдзіны XVIII — пачатку XIX ст., яго рэпертуар, мастацкі ўзровень, грамадскае значэнне.

Тэатры першай паловы XIX — пачатку XX ст., іх арганізацыя, рэпертуар, гастрольная дзейнасць. Стварэнне В.Дунінным-Марцінкевічам беларускага аматарскага тэатра.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Аматарскія літаратурна-драматычныя гурткі, культурна-асветніцкія арганізацыі і таварыствы ў пачатку XX ст. у Беларусі. Беларускія вечарынкі, музычна-драматычныя і тэатральныя паказы — форма развіцця дэмакратычных народных традыцый.

Дзейнасць Першай беларускай трупы пад кіраўніцтвам І.Буйніцкага. Беларускія пісьменнікі, іх драматургічная творчасць і значэнне ў развіцці аматарскага тэатральнага мастацтва сярод насельніцтва.

Новыя формы і метады работы аматарскіх калектываў (1917—1920 гг.). Узмацненне палітыка-асветніцкай накіраванасці ў іх дзейнасці. Масавыя дзеянні на плошчах і вуліцах у дні свят. Агітстудыі, інсцэніроўкі, агітбрыгады, агіткалектывы і іншыя формы работы.

Маладзёжны гурток "Вянок" у Мінску. "Беларуская хатка". Першае таварыства беларускай драмы і камедыі. Драматургія У.Галубка на падмостках аматарскіх тэатраў. Сельская тэатральная самадзейнасць. Узнікненне аматарскіх музычна-драматычных калектываў на Случчыне, Чэрвеньшчыне, Гомельшчыне.

Аматарская тэатральная творчасць у Беларусі ў 20-я гады, першыя беларускія прафесійныя тэатры. Тэатралізаваныя паказы ў горадзе і "вясковы тэатр". Тэматыка і рэпертуар. Агітацыйны і прагандысцкі характар тэатральных пастановак. "Наш тэатр" у Мінску. Клуб "КІМ" і першы беларусі ТРАМ (Тэатр рабочай моладзі). Дзейнасць ТРАМаў. Іх уплыў на масавую і тэатральную самадзейнасць (канец 20 — пачатак 30-х гадоў). Арганізацыя калгасна-саўгасных тэатраў.

Тэатральнае мастацтва Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны (1941—1945 гг.).

Аматарскі тэатральны рух у пасляваенныя гады. Нараджэнне першых народных тэатраў (канец 50-х гадоў) як якасна новая з'ява ў тэатральным жыцці. Рэпертуар тэат-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ральных калектываў у 60-я гады. Развіццё аматарскага тэатра ў 70—80-я гады. Масавасць тэатральнай самадзейнасці. Узнікненне ў 90-х гадах тэатраў-студый, паўпрафесійных тэатраў і інш. Сучасная тэатральная справа: арганізацыйныя, мастацка-эстэтычныя і творчыя аспекты.

Сацыяльнае прызначэнне аматарскага тэатра і яго адрозненне ад прафесійнага тэатра. Новая якасць зместу і мэты дзейнасці аматарскага тэатра.

Творчы працэс як сродак выхавання і духоўнага развіцця чалавека. Узаемасувязь і ўзаемазалежнасць творчага працэсу і грамадскай значнасці вынікаў дзейнасці аматарскага тэатра.

Асноўнай мэтай і задачай дадзенай тэмы з'яўляецца выяўленне шляхам гістарычнага аналізу сутнасці, прыроды і спецыфікі аматарскага тэатра і на гэтай аснове вызначэнне методыкі работы рэжысёра і творчага калектыву.

### *Тэма 4. Рэжысёр аматарскага тэатра*

Рэжысёр як псіхолаг, які разумее ўнутраны свет чалавека і актыўна ўздзейнічае на яго выхаванне ў працэсе работы над роляй з удзельнікамі калектыву.

Рэжысёр як педагог, які фарміруе прафесійныя навыкі акцёраў-аматараў; арганізатар выхаваўчай і вучэбна-творчай работы ў калектыве.

Рэжысёр як інтэрпрэтатар драматургічнага твора, пастаноўшчык спектакля, які валодае комплексам прафесійных навыкаў і ўменняў (работа над п'есай, з артыстамі, з мастаком, кампазітарам, з дапаможнымі цэхамі).

Рэжысёр як арганізатар, кіраўнік разнастайнага жыцця калектыву (вучэбна-выхаваўчай работы, рэпертуарнага працэсу, вольнага часу і інш.)

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Асобасная характарыстыка рэжысёра, узровень ведаў у галіне тэатра, уменне рэалізаваць іх на практыцы, наяўнасць прафесійных навыкаў, інтэлігентнасць, культура.

Высокая патрабавальнасць рэжысёра да самога сябе, адказнасць перад удзельнікамі калектыву.

Асабісты прыклад рэжысёра ва ўзаемаадносінах з творчымі і тэхнічнымі работнікамі тэатра. Неабходнасць праяўлення ва ўзаемаадносінах з імі вытрымкі, прынцыповасці, цярпення, такту і павагі да асобы, таленту.

Здольнасць да аналізу і мастацка-творчага прагназіравання. Выпрацоўка рэжысёрам крытэрыяў ацэнкі мастацкага твора, здольнасць кіравацца імі ў практычнай дзейнасці.

Валоданне навыкамі псіхолага-педагагічнага аналізу дзейнасці творчай асобы, спосабамі і формамі міжасобасных зносін. Выкарыстанне метаду выхавання ў творчай рабоце: уменне зацікавіць, пераканаць і весці за сабой людзей. Пошук новых, гнуткіх і дзейсных формаў адкрытага, узаемадаверлівага супрацоўніцтва з удзельнікамі творчага калектыву.

## *Тэма 5. Стварэнне аматарскага тэатральнага калектыву як працэс. Прынцыпы этыкі К.С.Станіслаўскага — падмурак для фарміравання калектыву*

Стварэнне калектыву, у якім цесна пераплецены пытанні арганізацыйныя, выхаваўчыя і творчыя.

Першаснае стварэнне калектыву. Прынцыпы набору. Метадычныя задачы, якія стаяць перад кіраўніком на гэтым этапе.

Аднаўленне калектыву, які перапыніў сваё існаванне. Метадычныя задачы кіраўніка ў гэтых умовах.

Важнасць разумення кіраўніком калектыву як спецыяльнага арганізма духоўнай супольнасці людзей,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

аб'яднанага адной творчай мэтай; разуменне асноўных шляхоў развіцця і перспектыў жыццядзейнасці калектыву.

К.С.Станіслаўскі і У.І.Неміровіч-Данчанка аб стварэнні тэатра на новых ідэйна-маральных і эстэтычных асновах, здольнага вырашаць вялікія задачы (ідэйныя, асветніцкія, грамадскія, мастацкія і інш.) Вучэнне К.С.Станіслаўскага аб этыцы і яго значэнне ў практыцы работы аматарскага тэатра.

Пастаноўка спектакля ў створаным аматарскім тэатры — важнейшы сродак вырашэння выхаваўчых і мастацкіх задач у іх адзінстве, надзейны спосаб згуртавання творчага калектыву. Сістэма К.С.Станіслаўскага як творчая аснова павышэння прафесійнага мастацкага ўзроўню членаў калектыву. Вучэнне К.С.Станіслаўскага аб звышзадачы і скразным дзеянні як мэта і сэнс творчай дзейнасці аматарскага тэатра.

Аматарскі тэатр як сацыяльны арганізм, усе члены якога звязаны вузамі адказнай залежнасці. Глыбокае разуменне таго, што фарміраванне творчага калектыву не аднаразовы акт, а працяглы, шматгадовы працэс. Асабісты прыклад рэжысёра — важнейшы фактар у фарміраванні маральных асноў калектыву.

Статут тэатральнага калектыву як паказчык яго сталасці, як звод маральных законаў, прынятых усімі членамі калектыву. Выпрацоўка статута як калектыўная праца.

### *Тэма 6. Рэпертуар — люстэрка творчага калектыву. Мастацкія і метадычныя прынцыпы фарміравання рэпертуару. Рэпертуарная палітыка аматарскага тэатра як сродак выхавання асобных якасцей удзельнікаў*

Прынцыпы фарміравання рэпертуару (мастацкія, метадычныя). Рэпертуарная палітыка аматарскага тэатра як сродак выхавання асабістых якасцей удзельнікаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Рэпертуар як выяўленне мастацкай накіраванасці тэатральнага калектыву, люстэрка тэатра. Рэпертуар як мастацкі змест работы калектыву.

Рэпертуар як падстава для творчых дыскусій. Класічныя творы на сцэне аматарскага тэатра, іх значэнне для творчага росту ўдзельнікаў калектыву і выхавання эстэтычнага густу гледачоў. Неабходнасць пастаноўкі п'ес сучаснай тэматыкі. Эстэтычныя межы дакументальнасці і мастацкасці. Магчымасць і важнасць пастаноўкі эксперыментальных спектакляў.

Працэс фарміравання рэпертуару як доўгатэрміновая, перспектыўная ідэйна-мастацкая і педагагічная праграма рэжысера, кіраўніка калектыву.

Дыдактычныя прынцыпы фарміравання рэпертуару: пасільнасць, даступнасць, паслядоўнасць ускладнення (з ростам майстэрства асобных удзельнікаў і ўсяго калектыву), паступальнае і паслядоўнае раскрыццё асноўнай тэмы тэатра і інш.

Рэпертуарная лінія як своеасаблівая творчая і педагагічная "палітыка" рэжысёра, якая ўлічвае вострыя праблемы сучаснасці, а таксама магчымасці калектыву, яго здольнасці.

Тэатр і сучасныя фінансава-эканамічныя прынцыпы стымулявання творчасці; праблемы камерцыялізацыі дзейнасці тэатральнага калектыву.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# Раздзел II
# Вучэбна-выхаваўчая работа ў аматарскім тэатры

## *Тэма 7. Комплекснасць выхавання ў аматарскім тэатры*

Выхаванне як мэтанакіраваны працэс і сістэматычнае ўздзеянне на развіццё чалавека з мэтай падрыхтоўкі яго да выканання вызначаных роляў у сістэме грамадскіх адносін.

Праца ў аматарскім тэатральным калектыве як частка агульных задач выхавання: папаўненне ведаў, фарміраванне светапогляду, актыўнай грамадзянскай пазіцыі, сцвярджэнне высокіх ідэйных, маральных, эстэтычных ідэалаў, набыццё і павышэнне ўзроўню прафесійных навыкаў, далучэнне да духоўнасці, выхаванне культуры, сапраўднай інтэлігентнасці.

Асаблівасці выхаваўчага працэсу ў аматарскім тэатры: добраахвотнасць аб'яднання, заняткі ў вольны час, масавасць, самакіраўніцтва і інш.

Крытэрыі грамадскай значнасці аматарскага тэатральнага мастацтва:

— узровень развіцця калектыву як сацыяльнага арганізма;

— ступень задавальнення працэсам работы і яго вынікамі ўдзельнікаў калектыву;

— ідэйна-мастацкая годнасць створаных калектывам спектакляў, іх грамадская вартасць (узаемасувязь творчага працэсу і вынікаў);

— узровень развіцця ва ўдзельнікаў якасцей асобы.

Выхаваўчыя функцыі сцэнічнага мастацтва ў працэсе мастацкай творчасці. Месца і роля жыццёвых назіранняў, ведаў, перакананняў у працэсе работы над спектаклем. Творчая задума і яе ўвасабленне. Пошук і эксперымент у тэатральнай творчасці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Перакананне, навучанне, патрабаванне, заахвочванне, пакаранне як метады выхаваўчай работы. Асаблівасці прымянення іх ва ўмовах аматарскага тэатральнага калектыву.

Комплекснасць, сістэматычнасць, паслядоўнасць, лагічнасць, дакладная накіраванасць як рашаючая ўмова эфектыўнасці выхаваўчага працэсу. Педагагічны такт рэжысёра ў выхаваўчым працэсе.

***Тэма 8. Выхаваўчыя сродкі тэатральнага калектыву***

Бесперапыннасць навучання, выхавання і творчасці ў аматарскім тэатры.

Рэпетыцыя як асноўная форма заняткаў у тэатральным калектыве.

Неабходнасць прысутнасці на рэпетыцыях усіх удзельнікаў у перыяд фарміравання, станаўлення, абнаўлення калектыву.

Недапушчальнасць ператварэння рэпетыцый у завучванне тэксту, у механічнае паўтарэнне мізансцэн і інш. Недапушчальнасць адмены рэпетыцый з-за адсутнасці каго-небудзь з удзельнікаў (адмена рэпетыцый як мера пакарання). Кожная рэпетыцыя для ўдзельнікаў — чарговы этап у пазнанні. Методыка ўключэння ўсіх удзельнікаў калектыву ў рэпетыцыйны працэс.

Прыязная, творчая атмасфера на рэпетыцыях — зарука паспяховай работы над спектаклем, аснова фарміравання працоўнага калектыву.

Два саставы выканаўцаў як адна з мер барацьбы з зазнайствам, "прэм'ерствам" у калектыве. Неабходнасць аднолькавых рэпетыцыйных умоў для абодвух складаў і аднолькавых умоў для выступлення перад гледачамі. Выхаванне ў выканаўцаў цярплівасці, дружалюбнасці, узаемавыручкі ў адносінах адзін да аднаго.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Выбар п'есы. Залежнасць узроўню прафесійнага майстэрства, грамадзянскай сталасці калектыву ад ідэйна-мастацкага зместу п'есы. Ускладненне рэпертуару па меры павышэння прафесійнага майстэрства і грамадзянскай сталасці калектыву.

Арганізацыя работы над п'есай як спосаб духоўнага (інтэлектуальнага, маральнага, мастацкага, эмацыянальнага і інш.) узбагачэння удзельнікаў:

— сустрэча з драматургам, літаратуразнаўцам, тэатразнаўцам і інш.;

— збор іканаграфічных матэрыялаў аб аўтары і п'есе;

— наведванне музеяў, выставак і інш.;

— сустрэчы з цікавымі людзьмі, спецыялістамі розных галін вытворчасці, навукі і тэхнікі.

П'еса як адзін з важных сродкаў духоўнага ўзбагачэння ўдзельнікаў калектыву. Абуджэнне актыўнасці ўдзельнікаў пры сумесным аналізе п'есы.

Уменне рэжысёра падвесці ўдзельнікаў да эцюдаў і абудзіць у іх цікавасць да працэсу дзеяння. Уменне рэжысёра выкарыстаць эцюды для раскрыцця розных маральных з'яў у п'есе, у жыцці і ў калектыве ў выхаваўчых мэтах.

Размеркаванне роляў як творчы і выхаваўчы працэс і як метад заахвочвання або пакарання.

Вучэбная работа ў калектыве як умова росту прафесійнага майстэрства ўдзельнікаў і барацьбы з дылетантызмам. Спосабы і формы арганізацыі вучэбных заняткаў.

Самадзейная дзіцячая тэатральная студыя як рэзерв папаўнення аматарскага тэатра. Выкарыстанне студыйцаў у спектаклях аматарскага тэатра як сродак заахвочвання. Праблемы студыйнасці.

Агульнасць і ўзаемасувязь задач, якія стаяць перад дзіцячымі і юнацкімі тэатральнымі калектывамі, з маральна-эстэтычным выхаваннем у навучальных установах.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Гульня — асноўны метадычны прынцып вучэбна-творчай работы студыі.

### *Тэма 9. Планаванне работы тэатральнага калектыву*

Планаванне работы аматарскага тэатра як працэс, які прадугледжвае перспектыўнае развіццё калектыву на працягу аднаго або некалькіх сезонаў. Мэты і задачы перспектыўнага планавання. Улік пры планаванні ўсіх сфер жыццядзейнасці тэатральнага калектыву.

План работы калектыву як пастаноўка канкрэтных задач:

— арганізацыйная (дадатковы набор, дні і гадзіны заняткаў, падрыхтоўка памяшкання для заняткаў і рэпетыцый, паказ спектакляў на стацыянары і на выездзе, арганізацыя работы тэхнічных цэхаў і інш.);

— вучэбна-выхаваўчая (планаванне вучэбных заняткаў па майстэрстве акцёра, сцэнічнай мове, сцэнічным руху, гісторыі тэатра і інш.; планаванне рэпетыцый, лекцый па актуальных пытаннях сучаснага тэатральнага працэсу ў краіне і за яе межамі, творчых сустрэч з майстрамі сцэны, музыкі і інш.);

— мастацка-творчае планаванне рэпертуару, улік часу на падрыхтоўку чарговага спектакля, на яго афармленне, планаванне работы студыі, планаванне аднаўлення раней пастаўленых спектакляў, планаванне ўдзелу тэатральнага калектыву ў мерапрыемствах Дома культуры.

Дакументацыя тэатральнага калектыву, журнал уліку работы, картатэка ўдзельнікаў. Дакументы ўнутранага жыцця калектыву: фоталетапіс (альбом), творчы дзённік тэатра, дзённік рэпетыцый, кніга водгукаў.

Узгадненне плана работы тэатра з агульным планам работы Дома культуры (клуба). Узгадненне плана выпуску чарговага спектакля з кіраўніком Дома культуры.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### *Тэма 10. Формы павышэння кваліфікацыі рэжысёраў аматарскіх тэатраў*

Высокая кваліфікацыя рэжысёра — важнейшая ўмова для арганізаванай і прафесійнай работы, якая праводзіцца ў аматарскім тэатральным калектыве. Бесперапынная самаадукацыя рэжысёра — зарука яго далейшых поспехаў.

Калектыўная форма павышэння кваліфікацыі: арганізацыя Беларускім дзяржаўным інстытутам праблем культуры, абласнымі навукова-метадычнымі цэнтрамі курсаў, семінараў для рэжысёраў аматарскіх тэатраў.

Семінары як сістэматычная форма навучання (перыядычна паўтораная) для вопытных рэжысёраў і іх малодшых калег.

Фестывальны рух (рэспубліканскія і абласныя фестывалі тэатральнай творчасці) як форма павышэння кваліфікацыі рэжысёраў. Лабараторыі, якія праводзяцца ў час фестываляў, як форма абмену творчым вопытам паміж рэжысёрамі аматарскіх тэатраў.

Стажыроўка рэжысёраў у прафесійных тэатрах Рэспублікі Беларусь і ў вядучых аматарскіх тэатрах.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Раздзел III
## Аматарскі тэатр і яго роля ў сацыяльна-культурным жыцці грамадства

### *Тэма 11. Удзел аматарскага тэатра ў мастацка-пазнавальнай рабоце розных устаноў (навучальных, культуры і інш.)*

Грамадская значнасць, накіраванасць і эмацыянальная даступнасць тэатральнага мастацтва як фактары выкарыстання яго вялікай выхаваўчай сілы ў розных формах работы ўстаноў культуры і навучальных устаноў.

Тэатральны калектыў — галоўная дзеючая асоба ў арганізацыі і правядзенні заняткаў тэатральных факультэтаў, тэматычных вечароў і іншых формаў клубнай работы.

Тэатральны калектыў і агульнаадукацыйная школа (ліцэй, гімназія, тэхнікум і інш.).

Тэатральны калектыў і падшэфная дзіцячая студыя.

Аматарскі тэатр і яго месца ў культурным жыцці горада, раёна, вобласці. Сувязь аматарскага тэатра з іншымі "духоўнымі" інстытутамі: рэлігійныя суполкі, царква, універсітэт культуры і інш.

Аматарскі тэатр і яго роля ў жыцці грамадства.

### *Тэма 12. Аматарскі тэатр як метадычны цэнтр культуры горада, раёна*

Аматарскі тэатр як форма самадзейнага мастацтва. Матэрыяльная база і творчыя кадры аматарскіх тэатраў (народных, узорных): галоўны рэжысёр, педагог па майстэрстве акцёра, мастак — загадчык пастановачнай часткі, ад якіх залежыць дакладны рэжым работы тэатра (вучэбныя заняткі, рэпетыцыі, планамерны выпуск спектакляў). Творчы вопыт і прафесійная сталасць вядучых аматарскіх тэатраў, якія дазваляюць выкарыстоўваць іх у

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

якасці метадычных цэнтраў тэатральнай самадзейнасці ў дадзеным раёне.

Рэжысёр аматарскага (народнага) тэатра як кіраўнік творчых семінараў для кіраўнікоў тэатральных калектываў і гурткоў на прадпрыемствах і ў навучальных установах.

Формы метадычнай дапамогі: прагляды і абмеркаванні ў народным (узорным) тэатры рэпетыцый, спектакляў, урокаў па майстэрстве акцёра, сцэнічнай мове, сцэнічным руху; творчая дапамога рэжысёра народнага (узорнага) тэатра ў выглядзе кансультацый тэатральным калектывам на месцах; узаемаабмен выканаўцамі адной ролі для ўдзелу ў спектаклі (гэта форма практычна рэдка сустракаецца); правядзенне паказальных заняткаў, рэпетыцый, урокаў па майстэрстве акцёра і інш.

Творчае ўзаемадзеянне тэатральных калектываў рознага ўзроўню — гарант паспяховага развіцця аматарскага тэатральнага руху.

Розныя формы творчых узаемаадносін аматарскага і мясцовага прафесійнага тэатра.

### *Тэма 13. Тэатр і глядач: праблемы ўзаемасувязі*

Аматарскі тэатр і яго глядач, характар іх узаемаадносін.

Вывучэнне патрабаванняў гледача (канферэнцыі гледачоў, абмеркаванне спектакляў і інш.).

Сацыялагічныя даследаванні рэальных і патэнцыяльных глядацкіх аўдыторый. Методыка складання анкет і правядзенне анкетавання сіламі ўдзельнікаў творчага калектыву.

Неабходнасць выхавання ва ўдзельнікаў калектыву адказных адносін да гледача. Выхаванне ў гледача тэатральнай культуры, паважлівага стаўлення да аматарскага тэатра і яго работы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Афіша, анонсы аб спектаклях, прэм'ерах, паведамленні на мясцовым тэлебачанні, радыё, у газетах — важнейшыя ўмовы прапаганды тэатральнага калектыву.

Кніга водгукаў, рэцэнзіі ў мясцовым друку, адкрытыя абмеркаванні спектакляў і іншае як фактары ўзмацнення аўтарытэту тэатральнага калектыву і росту зацікаўленасці да яго.

Аматарскі тэатр як прапагандыст тэатральнага мастацтва. Работа па стварэнні фінансавых умоў для пастаноўкі новых спектакляў. Пытанні планавання і арганізацыі працы з гледачамі. Пракат спектакляў з улікам паступовага выхавання глядацкіх густаў.

Клуб аматараў тэатральнага мастацтва, які арганізоўваецца пры дапамозе самадзейнага тэатра.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## *ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА*

### *Літаратура*


*Асноўная*

1. *Бузук, Р.Л.* Беларускі тэатр і глядач на парозе XXI стагоддзя / Р.Л.Бузук. – Мн.: Бел. ІПК, 2004. – 256 с.
2. *Зись, А.Я.* Искусство и эстетика / А.Я.Зись. – М.: Искусство, 1967. – 440 с.
3. *Каверин, Ф.Н.* Достижения и ошибки театральной самодеятельности / Ф.Н.Каверин. – М.: Искусство, 1953. – 215 с.
4. *Пятровіч, С.А.* Народныя тэатры Беларусі / С.А.Пятровіч. – Мн.: Навука і тэхніка, 1966. – 309 с.
5. *Сохар, Ю.М.* Жывая крыніца: тэатральная самадзейнасць на сучасным этапе / Ю.М.Сохар. – Мн.: Навука і тэхніка, 1983. – 73 с.
6. *Сухомлинский, В.А.* О воспитании / В.А.Сухомлинский. – М.: Молодая гвардия, 1973. – 223 с.
7. *Сухомлинский, В.А.* Мудрая власть коллектива / В.А.Сухомлинский. – М.: Молодая гвардия, 1975. – 320 с.
8. *Шахматов, Л.* От студии к театру / Л.Шахматов. – М.: ВТО, 1970. – 185 с.

*Дадатковая*

1. *Бузук, Р.Л.* Тэатральныя далягляды / Р.Л.Бузук. – Мн.: Навука і тэхніка, 1990. – 144 с.
2. *Гаробчанка, Т.Я.* На мяжы стагоддзяў: Сучасны беларускі драматычны тэатр / Т.Я.Гаробчанка. – Мн.: Бел. навука, 2002. – 367 с.
3. *Горчаков, Н.М.* Работа руководителя театрального коллектива с исполнителями / Н.М.Горчаков. – М.: Искусство, 1963. – 215 с.
4. *Немирович-Данченко, Вл.И.* О творчестве актера / Вл.И.Немирович-Данченко. – М.: Искусство, 1984. – 525 с.
5. *Смольскі, Р.Б.* Контуры новага часу: Праблемы бел. тэатра і маст. адукацыі ў прасторы XXI стагоддзя / Р.Б.Смольскі. – Мн.: БДАМ, 2011. – 196 с.
6. *Товстоногов, Г.А.* О профессии режиссера / Г.А.Товстоногов. – М.: ВТО, 1965. – 303 с.
7. *Эфрос, А.В.* Репетиция – любовь моя / А.В.Эфрос. – М.: Искусство, 1975. – 319 с.
8. *Эфрос, А.В.* Профессия: режиссер / А.В.Эфрос. – М.: Искусство, 1979. – 399 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ